Адна з лепшых беларускіх паэтак Яўгенія Іосіфаўна Янішчыц нарадзілася 20 лістапада 1948 года ў вёсцы Рудка Пінскага раёна ў сялянскай сям'і. Скончыла філалагічны факультэт Белдзяржуніверсітэта. Загадвала бібліятэкай у ЦК ЛКСМБ, аддзелам паэзіі ў часопісе «Маладосць», працавала літкансультантам у «Сельской газете». Першыя творы надрукаваны ў снежні 1962-га ў райгазеце «Палеская праўда». Паэтка — лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі за кнігу «Дзень вечаровы» і Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы за кнігу «Пара любові і жалю». Яе імя ў вёсцы Парэчча носіць базавая школа, пры якой працуе літаратурны музей. Яўгенія Янішчыц трагічна загінула 25 лістапада 1988 года.

У першыню ўбачыў Жэню ў 1971-м у студэнцкім інтэрнаце на Паркавай, дзе разам з намі, журналістамі, на розных паверхах жылі філолагі і біёлагі. З сябрам-аднакурснікам Валодзем Саламахам, былым вайскоўцам, будучым вядомым беларускім пісьменнікам, зайшлі аднойчы да сваёй знаёмай Людмілы Забалоцкай, калісьці супрацоўніцы чавускай раёнкі «Іскра», якая вучылася на другім курсе філфака і на рахунку якой будуць з цягам часу тры зборнікі вершаў. Акрамя яе, у пакоі знаходзіліся яшчэ дзве дзяўчыны. Імі аказаліся дачка тагачаснага загадчыка аддзела культуры «Праўды» Таццяна Кошачкіна, якую бацька адправіў з Масквы ў Мінск да цёткі «на перавыхаванне», і студэнтка апошняга курса факультэта Яўгенія Янішчыц. Першая, мілавідная, сядзела за сталом з рознымі жаночымі прычындаламі перад круглым люстэркам, другая, хударлявая, сімпатычная, — каля бывалай тумбачкі з тоўстым сшыткам і ручкай.

— Жэня, — звярнулася да другой праз пэўны час Забалоцкая, — прачытай штонебудзь хлопцам, ім будзе цікава...

— Упэўнена? — павярнула ў наш бок галаву Яўгенія. Яна крыху яшчэ пасядзела на ложку, мабыць, у творчай задумлівасці, для Жэні яшчэ адным цяжкім ударам лёсу. А дагэтуль ранняя смерць бацькі, развод з мужам-паэтам Сяргеем Панізнікам і аўтакатастрофа ў Магілёве, пасля якой са шматлікімі пераломамі яна два месяцы праляжала ў рэанімацыі. Пазней — цяжкая хвароба сына Андрэя. Яму прысвяціла за кароткі тэрмін ажно 11 паэтычных частак.

Своеасаблівым суцяшэннем стала атрыманне кватэры ў цокальным паверсе дома на Ульянаўскай. Каля акна стол, побач з якім канапа. На ёй гаспадыня сваіх «хоромов» раскладвала новыя вершы... Яны ўваходзілі потым у новыя зборнікі: «На беразе пляча», «Пара любові і жалю», «Каліна зімы». Да іх, пасля «Снежных грамніц», убачылі свет кніжкі «Дзень вечаровы» і «Ясельда».

Апошняя з названых была надрукавана ў 1978-м, калі Жэня працавала ўжо ў «Сельской газете». Яна прыйшла ў рэдакцыю ў 1976-м, праз год пасля мяне. Калі я, зменны сакратар, нешта ўдакладняў загадчыцы аддзела культуры, да яе ў кабінет зайшлі дзве дзяўчыны. Літкансультант, выдатная наша паэтка Валянціна Коўтун і Жэня Янішчыц, якую і праз гады нельга было не пазнаць! Напярэдадні Валянціна казала мне, што пасля шасці гадоў працы ў «сельчанке» збіраецца перайсці на новае месца. Жэня трымала ў руцэ сваю кніжку «Дзень вечаровы». Валянціна прадставіла загадчыцы сваю зменшчыцу і запэўніла: «Лепшай кандыдатуры не знойдзеш». Каб не перашкаджаць «перамовам», я пажадаў Жэні поспехаў, на што яна, дэманструючы на правай шчацэ характэрную ямачку, прыемна ўсміхнулася...

Яе вершы прасякнуты вялікай адданасцю роднай зямлі,

галаву Яўгенія. Яна крыху яшчэ пасядзела на ложку, мабыць, у творчай задумлівасці, потым хуценька паднялася, паправіла валасы і прачытала верш, з якога на ўсё жыццё ўрэзаліся ў памяць словы «пачынаецца ўсё з любві».

Нашы апладысменты былі і гучныя, і ўдзячныя, і шчырыя.

— Гэта з маёй першай кніжкі «Снежныя грамніцы», у мінулым годзе выйшла, калі не ведаеце, — неяк гулліва-ганарліва прамовіла аўтарка, зноў паправіла валасы і гэтаксама хуценька прысела ля тумбачкі...

Ну як было з ёй не пагадзіцца, што ўсё пачынаецца менавіта з незвычайнага, невыразнага і глыбока патаемнага пачуцця сардэчнай прыхільнасці?!

На наступны дзень я выйшаў з кнігарні са «Снежнымі грамніцамі», якія разам з некаторымі іншымі зборнікамі Жэні беражліва захоўваю ў хатняй бібліятэцы. Рыхтуючы гэты артыкул, найперш узяў у рукі, вядома ж, тую кнігу. Адразу знайшоў памятны верш, які стаў песняй. Яго чытала нам у інтэрнаце Жэня:

Ты пакліч мяне. Пазаві.
Там заблудзімся ў хмельных травах.
Пачынаецца ўсё з любві,
Нават самая простая ява.
І тады душой не крыві
На дарозе жыцця шырокай.
Пачынаецца ўсё з любві -
Першы поспех і першыя крокі.
Прыручаюцца салаўі,
І змяняюцца краявіды.
Пачынаецца ўсё з любві -
Нават ненавісць і агіда...
Ты пакліч мяне. Пазаві.
Сто дарог за маімі плячыма.
Пачынаецца ўсё з любві,
А інакш і жыць немагчыма.

Словы «пачынаецца ўсё з любві» — лейтматыў і ўсяго складанага жыцця паэткі, і яе непаўторнай творчасці, у якой пераважае хвалюючая, шчырая лірыка. Чытаеш вершы «Хаджу па нівах, па лугах азёрных», «Вясковае», «Пра атаву напомніць прасіла?», «Чаму ніколі не баюся я...», «Славянскае застолле», «Прыедзь у край мой ціхі» — і ўяўляеш верас, крыніцу і грыбок роднай дубровы. Чуеш нетаропкую палескую гаворку, якая ўліваецца ў агульную мову, нібы празрысты ручай. «...І што ні двор — то песня», — зазначае яна ў адным з вершаў. Бачыш карову, якую цётка

«Ты пакліч мяне. Пазаві...»

Споўнілася 75 гадоў з дня нараджэння палескай ластаўкі Яўгеніі Янішчыц, якая працавала ў «Сельской газете» літкансультантам

Клава прывычна гоніць «на атаву, што буйна шуміць», бачыш перавозчыкі-каўшы, рыжы, жоўта-залаты ліст і даспелыя ружовыя рабіны, што задуменна ўпалі на платы. Адчуваеш горкі пах палыну і водар свята ў лясах.

Янішчыц не баіцца апусташэння галавы і сэрца. Тлумачыць гэта тым, што ў яе ёсць зялёная зямля. Мазалі на пальцах — ад любові да Радзімы, якая «магутней слабасці і смерці». Яе зялёная зямля — гэта не толькі малая радзіма. Гэта яшчэ і «пазбаўленая недахопаў і недасканаласці эстэтычная рэальнасць, і крыніца творчага натхнення, і гаючы эліксір душы». А калі ў гэтай душы ўзнікае глыбінная туга, то яна — па ціхіх берагах, па галасах продкаў, якія жылі ў родным краі, куды паэтка запрашае сяброў пабачыць хараство і самабытнасць палескіх краявідаў:

Па травах светла-шызых
Мы пройдзем ля ракі,
Дзе, мыючы бялізну,
Вядуць сваё жанкі.
І будзе песня спета
Пра шчасце і бяду,
І будзе падаць лета
Ў гуллівую ваду.

Як жа ўсё гэта многім з нас блізка і дорага, як міла і кранальна! Увогуле, тэма роднага краю чырвонай ніткай праходзіць праз усю творчасць Янішчыц. Крытыкі і літаратуразнаўцы аднагалосна падкрэсліваюць, што глыбокае пранікненне ва ўнутранае «я» чалавека дазволіла ёй стварыць шэраг праўдзівых вобразаў вяскоўцаў, паказаць сілу і веліч простага селяніна. І сапраўды, глядзіш праз шчымлівыя радкі на паэтычныя партрэты Жэніных землякоў, у ліку якіх Сымон, Насця, Усціння, Сава, Марыя, Павел, Нікан, Зінька, Паланея, і ўяўляеш сваіх.

Жэня ўспрымала працавітых, сумленных палешукоў як амаль святых, называла іх «апосталамі», «інтэлігентамі ад зямлі». Яе вершы прасякнуты вялікай адданасцю роднай зямлі, непадробленай любоўю да непаўторных лугоў, палёў і старажытных лясоў. Тонка адчуваючы кроўную сувязь з мілым сэрцу куточкам, паэтка ўражвае нас глыбінёй асэнсавання складаных жыццёвых праблем і сцвярджэннем высокачалавечых адносін паміж людзьмі.

Зусім не выпадкова яшчэ ў 1964-м, калі ў «Бярозцы» надрукавалі яе верш «Зоры над Пінаю», на Яўгенію звярнулі ўвагу сябры рэдкалегіі часопіса Пятрусь Броўка, Рыгор Барадулін і Еўдакія Лось. Яўгенія Янішчыц і Еўдакія Лось моцна пасябравалі. Маладзейшая з вялікай удзячнасцю прымала ад старэйшай каштоўныя для сябе творчыя і жыццёвыя парады. Заўчасны сыход Еўдакіі ва ўзросце 48 гадоў стаў

Яе вершы прасякнуты вялікай адданасцю роднай зямлі, непадробленай любоўю да непаўторных лугоў, палёў і старажытных лясоў.

Калі вярнуўся, у кабінеце была толькі гаспадыня, якая гартала Жэніну кніжку з аўтографам, чым і пахвалілася. Сказаў, што даўно сачу за творчасцю «палескай ластаўкі», як называлі паэтку, і папрасіў паглядзець выданне. Прачытаў вершы — і працяўся вялікай тугой, вялікім расчараваннем у каханні, якое сам калісьці адчуваў. Як жа я разумеў Жэню, як хацелася яе падтрымаць, суцешыць, абнадзеіць, даць нейкую добрую параду... Праз два гады Янішчыц будзе прэзентаваць у рэдакцыі свой новы зборнік паэзіі пад назвай «Ясельда». Асабліва запалі ў душу, як цяпер памятаю, надрукаваныя ў ім вершы пра Еўдакію Лось і маму:

Між калючых ліловых ажын,
Дзе адправіла лета дажынкі,
Зашкадуюся першых хмурын
Да буйной накіпелай дажджынкі.
Блісне зорка. Праявіцца дзень.
І падасца імгненнем разлука.
...Мама спелаю сцежкай ідзе,
Прапусціўшы наперад унука.

Жэня дасканала разглядала кожны дасланы ў рэдакцыю твор. Адных аўтараў хваліла за ўдалыя сачыненні, абяцала надрукаваць. Іншым распавядала, чаму той ці іншы верш не падыходзіць. За кошт аўтараў-паэтаў павялічвалася пошта рэдакцыі!

Добра, што знайшліся людзі, якія прывялі ў парадак багатую літаратурную спадчыну слыннай паэткі. Дзякуючы намаганням сяброўкі Жэні, паэткі Тамары Аўсяннікавай, і вядучага навуковага супрацоўніка Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы НАН Беларусі Святланы Калядкі пабачылі свет тры з чатырох запланаваных тамоў «Яўгенія Янішчыц: творы, жыццяпіс, каментарыі». Чытайце гэтае ўнікальнае ў нашай жаночай літаратуры выданне!

Уладзімір БАРЫСЕНКА